# ВЫКАРЫСТАННЕ МАГЧЫМАСЦЕЙ ОНЛАЙН-ЗНОСІНАЎ ВА ЎМОВАХ ДВУХМОЎЯ ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЭФЕКТЫЎНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ: ІНТЭРНЭТ-СУПОЛЬНІЦТВА «АБ МАЛОЙ РАДЗІМЕ»

***Ірчыц Наталля Уладзіміраўна,***
*выхавальнік-метадыст дзяржаўнай установы адукацыі*
*«Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці № 1 г.Ліда»*
**E-mail:** dcrr1lida@yandex.by

Інтэрнэт-супольніцтва Дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці № 1 г.Ліда «Аб малой радзіме» створана з мэтай онлайн-узаемадзеяння з удзельнікамі адукацыйнага працэсу па далучэнню выхаванцаў да беларускай мовы, выхаванню ў іх патрыятычных пачуццяў.

Тэрмін «Інтэрнэт-супольніцтва» выкарыстоўваецца для абазначэння сацыяльнага аб'яднання карыстальнікаў камунікатыўных сетак, інтэграцыя якіх узнікае на аснове агульных інтарэсаў у віртуальнай прасторы ў працэсе камунікацыі.

Інтэрнэт-супольніцтва «Аб малой радзіме» забяспечвае магчымасць не толькі павышаць педагагічную кампетэнтнасць бацькоў выхаванцаў, знаёміць з інфармацыяй аб дзейнасці ўстановы па далучэнню дашкольнікаў да беларускай мовы, але і выкарыстоўваць рэсурс як камунікатыўную пляцоўку для ўсіх суб'ектаў адукацыйнага працэсу.

Канцэпцыя супольніцтва прадугледжвае сістэму інфармацыйнага абмену паміж карыстальнікамі-сааўтарамі рэсурса (педагогамі, законнымі прадстаўнікамі выхаванцаў), на абраную тэматыку. Пры гэтым інфармацыя мае варыятыўнасць прадстаўлення: тэкставы, графічны, відэа-, аўдыё-фарматы. Напрыклад, у графічным варыянце для аўдыторыі супольніцтва прадстаўлены фотасправаздачы з мерапрыемстваў па далучэнню выхаванцаў да беларускай культуры і мовы: *«Вячоркі», «Калядкі».*

Асаблівы рэзананс выклікала віртуальная фотавыстава *«Ад прадзедаў спакон вякоў...»*. На экспазіцыі прадстаўлены прадметы традыцыйна-бытавой этнаграфіі (талеркі-хлебніцы, плеценыя кошыкі, калаўроты, маслабойка і г.д.), керамічныя вырабы, драўляная разьбяная скульптура, вырабы з саломкі, тканіны і вышытыя вырабы. Апісанне прадметаў экспазіцыі прадугледжвае назву на беларускай мове і тлумачэнне паняцця на рускай мове.

Рэгулярна папаўняецца альбом *«Асалода роднай мовы»*. Першапачаткова альбом уключаў у сябе толькі фотаработы, створаныя ў рамках рэспубліканскага сацыяльнага праекту «Смак беларускай мовы». Аднак з часам ўдзельнікі-сааўтары супольнасці сталі папаўняць альбом і самастойна выкананымі фотаздымкамі, якія адпавядаюць канцэпцыі альбома. Гэта дапамагло арганізаваць віртуальны конкурс «*Малюем родную мову».* У рамках конкурсу яго ўдзельнікі (выхаванцы ДЦРДз пад куратарствам педагогаў або бацькоў) выконвалі малюнкі ў любой выяўленчай тэхніцы, адлюстроўваючы блізкае ўспрыманню дзіцяці паняцце на беларускай мове.

З мэтай азнаямлення бацькоў з формамі, метадамі, сродкамі фарміравання ў выхаванцаў камунікатыўных уменняў на беларускай мове размяшчаем ў супольнасці відэафрагменты арганізацыі адукацыйнага працэсу, рэалізацыі адукацыйнай ініцыятывы *«Цікава вучым родную мову»*.

Яшчэ адна наша знаходка – відэа-марафон *«Гаворым па-беларуску»*. У альбоме педагогі і законныя прадстаўнікі выхаванцаў размяшчаюць кароткія відэа, на якіх дзеці чытаюць вершы, невялікія па аб'ёму фрагменты літаратурных твораў, удзельнічаюць у гульнях-драматызацыях на беларускай мове.

У супольнасці прадстаўлены таксама розныя формы работы ў тэматычным ракурсе нашай малой радзімы: гэта і даследчыя дзіцячыя работы выхаванцаў, фотамарафоны, віртуальная галерэя дзіцячай творчасці і творчая палітра педагогаў.

Супольнасць знаходзіцца ў пастаянным развіцці, арыентуючыся на патрэбы і інтарэсы сваёй аўдыторыі. Аб запатрабаванасці рэсурсу сярод бацькоўскай грамадскасці сведчаць актыўнасць у абмеркаваннях, удзел ў онлайн-мерапрыемствах, статыстыка наведванняў і колькасць удзельнікаў супольнасці.

Безумоўнымі перавагамі супольнасці, на нашу думку, з'яўляюцца магчымасць актыўнага ўзаемадзеяння, звяртанне ўвагі сем'яў да пытання навучання дзяцей беларускай мове, далучэнне законных прадстаўнікоў выхаванцаў да гэтага складанага працэсу. На наш погляд, калі не толькі ва ўстанове, але і ў сям'і ў дзіцяці выхоўваецца любоў да роднай мовы, калі ствараецца моўнае асяроддзе, то і авалоданне мовай будзе больш паспяховым.